ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЇН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б)Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 2 (22) Аўторак, 16 студзеня 1945 г.

## Пастанова

### Выканкома Облсовета дэпутатаў працоўных і Абкома КП(б) Беларусі

### аб прысуджэнні пераходнага Чырвонага Сцягу Выканкома Облсовета дэпутатаў працоўных і Абкома КП(б) Беларусі

Выканком Брэсцкага Облсовета дэпутатаў працоўных і Абком КП(б)Беларусі пастанаўляюць:

1. Прызнаць пераможцам у соцыялістычным спаборніцтве Косаўскі раён (старшыня Выканкома райсовета дэпутатаў працоўных т. Баранаў, сакратар РК КП(б) Беларусі т. Кавалёў), які датэрмінова выканаў план лесанарыхтовак IV квартала на 200 проц. і план лесавывазак на 145 проц.
2. Прысудзіць пераходны Чырвоны Сцяг Выканкома Облсовета дэпутатаў працоўных і Абкома КП(б)Беларусі Косаўскаму раёну.

Старшыня Выканкома Брэсцкага Облсовета
дэпутатаў працоўных С. СІКОРСКІ.
Сакратар Брэсцкага Абкома КП(б) Беларусі
М. ТУПІЦЫН.

## ВЫШЭЙ СЦЯГ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ НА ЛЕСАНАРЫХТОЎКАХ І ВЫВАЗКАХ

Пастановай Выканкома Облсовета дэпутатаў працоўных і Абкома КП(б) Беларусі нашаму раёну прысуджан пераходны чырвоны Сцяг Выканкома облсовета дэпутатаў працоўных і Абкома КП(б)Б за перавыкананне плана лесанарыхтовак і вывазак у IV квартале.

Гэтую высокую ўзнагароду працоўныя нашага раёна заваявалі сваёй самаадданай, упартай працай на лесанарыхтоўках і вывазках.

Перадавыя лесарубы і возчыкі раёна Дзянісік Ігнат, Бялевіч Іларыён, Калеснік Рыгор, Бульскі Канстанцін, Шыркавец Александр, Рында Іосіф, Ламейка Сямён штодзённа перавыконвалі нормы выпрацоўкі ў 2—3 разы.

Добра працавалі на парыхтоўцы і вывазцы лесу комсамольцы Гошчаўскага, Яблонскага і Сенькавіцкага сельсоветаў. Комсамольцы Кот Сцепаніда, Дрозд Елена, Белая Марыя, працуючы на вывазцы лесу, рабілі па 2—3 рэйсы, што значна павышала прадукцыйнасць працы.

Партыйныя і совецкія арганізацыі апература кіравалі лесанарыхтоўкай і вывазкай, накіроўваючы на больш слабыя ўчасткі лепшых партыйных і совецкіх актывістаў.

У выніку такой работы план 4-га квартала па нарыхтоўцы лесу быў выканан на 200 проц., а па лесавывазцы—па 145 проц.

Зараз задача заключаецца ў тым, каб яшчэ вышэй падняць сцяг соцыялістычнай працы па нарыхтоўцы і вывазцы лесу. Мы павінны працаваць яшчэ лепш, чым у 1944 годзе, дабіваючыся штодзённага перавыканання норм выпрацоўкі.

Прысуджаны нашаму раёну пераходны Чырвоны Сцяг. Выканкома облсовета і Абкома КП(б)Б павінен назаўсёды астацца ў нашым раёне. А для гэтага трэба адно: па франтавому працаваць у лесе кожнаму лесарубу, кожнаму возчыку, кожнаму партыйнаму і совецкаму актывісту.

## НАШЫ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Аднаўленне Івацэвіцкага лесазавода пачалося зразу-ж пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

За кароткі час быў адноўлен лакамабіль у 120 конскіх сіл і ўстаноўлены тры лесарамы. Адна з гэтых рам ужо працуе поўным ходам. Толькі на працягу снежня месяца на ёй распілавана 712 кубаметраў сыравіны.

Адноўлен на 65 проц. лесаамбар, занава падведзена да завода чыгуначная калея ў 222 пагонных метры.

У гэтым годзе перад заводам адкрываюцца шырокія перспектывы яго дальнейшага развіцця і ўдасканалення.

Пры заводзе будзе абарудаван мебельны цэх, прадукцыя якога забяспечыць патрэбы не толькі Брэсцкай, але і Баранавіцкай абласцей.

Будзе таксама пабудован распіловачны цэх, які з адыходаў лесапілавання дасць гонту і другія віды вырабаў шырокага спажывання.

На раду з другімі работамі ў гэтым годзе намячаецца аднаўленне яшчэ аднаго лакамабіля ў 60 конскіх сіл, які прывядзе ў рух электрагенератар. Гэта дасць магчымасць забяспечыць электраасвятлом усе ўстановы і жылыя кватэры гарадскога пасёлка Івацэвічы.

Натхнёны гераічнымі перамогамі воінаў Чырвонай Арміі на ўсіх франтах вялікай Айчыннай вайны, калектыў рабочых і служачых завода з небывалым творчым уздымам працуе на карысць сваёй Радзімы.

Няма сумнення, што задачы пастаўленыя перад намі ў гэтым годзе будуць з чэсцю выкананы.

В. ВНУК, дырэктар лесазавода.

# У ЦК ЛКСМ Беларусі

ЦК ЛКСМ Беларусі прыняў ра-
шэнне аб правядзенні выбараў кі-
руючых комсамольскіх органаў у
гарадскіх, раённых і пярвічных
арганізацыях ЛКСМ Беларусі. Вы-
бары ў пярвічных комсамольскіх
арганізацыях будуць праходзіць з
25 студзеня па 15 лютага 1945
года, раённыя і гарадскія кан-
ферэнцыі і сходы — з 15 лютага
да 1 сакавіка 1945 года.

У гарадскіх, раённых комса-
мольскіх арганізацыях, якія на-
лічваюць менш 200 комсамоль-
цаў, праводзяцца справаздачна-
выбарчыя раённыя, гарадскія
сходы, а ў гарадскіх, раённых
комсамольскіх арганізацыях,
налічваюць больш 200 комсамоль-
цаў, праводзяцца канферэнцыі.
Норму прадстаўніцтва на канфе-
рэнцыі (модус) ЦК ЛКСМ Беларусі
ўстанавіў: для арганізацый, якія на-
лічваюць ад 200 да 500 комсамоль
цаў, — адзін дэлегат ад трох комса
мольцаў, для арганізацый, якія на-
лічваюць звыш 500 комсамольцаў —
адзін дэлегат ад пяці комсамольцаў.

ЦК ЛКСМ Беларусі абавязаў
абкомы, гаркомы, райкомы ЛКСМБ
у перыяд падрыхтоўкі да правя-
дзення выбараў узмацніць работу
па стварэнню пярвічных комса-
мольскіх арганізацый, асабліва на
прадпрыемствах, у калгасах і ў
вёсках заходніх абласцей БССР,
смялей і шырэй разгарнуць адбор
і ўцягненне ў рады комсамола
перадавой совецкай моладзі.

Выбары кіруючых комсамоль-
скіх органаў у ЛКСМ Беларусі
павінны прайсці пад знакам мабі-
лізацыі ўсіх сіл моладзі на боль-
шэвіцкае выкананне гістарычных
указанняў таварыша Сталіна, да-
ных у яго дакладзе і загадзе аб
XXVII гадавіне Вялікай Кастрыч-
ніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі.

У перыяд падрыхтоўкі і пра-
вядзення выбараў кіруючых ком-
самольскіх органаў ЛКСМ Белару-
сі неабходна дабіцца далейшага
павышэння палітычнай і працоў-
най актыўнасці мас комсамольцаў
і моладзі Беларусі ў справе ад-
наўлення народнай гаспадаркі і
ўсямернай дапамогі Чырвонай Ар-
міі, палепшыць работу па аргані-
зацыйна палітычнаму ўмацаванню
комсамольскіх арганізацый, забяс-
печыць уздым усёй палітычна-
выхаваўчай работы комсамола Бе-
ларусі, расшырэнне яго сувязей і
ідэйнага ўплыву на масы моладзі.

Справаздачна-выбарчыя сходы ў
пярвічных комсамольскіх аргані-
зацыях, справаздачна-выбарчыя
канферэнцыі і сходы ў раённых,
гарадскіх арганізацыях ЛКСМ Бе-
ларусі павінны быць праведзены
на высокім ідэйна-палітычным уз-
роўні, у строгай адпаведнасці з
інструкцыяй ЦК ВЛКСМ. Разгор-
тванне вострай большэвіцкай кры-
тыкі і самакрытыкі ўсіх недахо-
паў работы комсамольскіх аргані-
зацый, умацаванне ўнутрысаюз-
най дэмакратыі, згуртаванне і вы-
лучэнне баявога комсамольскага
актыва, здольнага на справе арга-
нізаваць выкананне задач комса-
мола, як баявога памочніка пар-
тыі Леніна—Сталіна, — ёсць важ-
нейшыя ўмовы паспяховага пра-
вядзення выбараў кіруючых ком-
самольскіх органаў у гарадскіх,
раённых і пярвічных арганізацы-
ях ЛКСМ Беларусі.

# Нарада сакратароў пярвічных комсамольскіх арганізацый

14 студзеня ў РК ЛКСМБ ад-
былася нарада сакратароў пярвіч-
ных комсамольскіх арганізацый
па пытанню падрыхтоўкі і правя-
дзення прадстаячых адчотна-вы-
барных комсамольскіх сходаў.

Інструктыўны даклад зрабіў сакратар РК ЛКСМБ т. Савін.

Дакладчык падкрэсліў важнасць правядзення адчотна-выбарчых сходаў і заклікаў правесці іх на высокім ідэйна-палітычным узроўні.

Затым сакратары пярвічных комсамольскіх арганізацый былі азнаёмлены з інструкцыяй ЦК ВЛКСМ аб практычнай рабоце па падрыхтоўцы і правядзенню адчотна-выбарных комсамольскіх сходаў.

# Заява Сакратара Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР таварыша А. Горкіна

У замежным друку ў апошні час распаўсюджваюцца чуткі, што Прэзідэнт Краёвай Рады Народовай пан Берут, будучы арыштаваны пры фашысцкім рэжыме Пілсудскага, быў абменен на аднаго паляка, які знаходзіўся ў СССР пад арыштам, і гэты абмен праведзен па згодзе паміж урадамі СССР і Польшчы.

Па ўпаўнаважанню Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР лічу сваім абавязкам заявіць, што гэтыя чуткі зусім не адпавядаюць сапраўднасці.

Сакратар Прэзідыума
Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

# ПАБУДОВАНА 38 НОВЫХ ХАТ

У сакавіку 1943 года нямецка-фашысцкія нягоднікі спалілі вёску Жытлін. Жыхары вёскі, спасаючыся ад фашысцкіх забойцаў уцяклі ў лес і жылі там пад абаронай партызан да вызвалення раёна часцямі Чырвонай Арміі.

З прыходам Чырвонай Арміі жытлінцы ўзяліся за адбудову сваёй вёскі. На сёнешні дзень у вёскі пабудавана 38 новых хат і 293 зямлянкі. Пабудавана новае памяшканне школы, у якім вучацца 104 вучні.

З надыходам вясны жыхары вёскі з новай сілай возьмуцца за аднаўленне сваёй вёскі. Мяркуецца, што да наступнай зімы усе жыхары будуць жыць у новых светлых хатах.

Е Кузменя.

# АДНОЎЛЕНА БАНЯ

Адноўлена і пушчана ў эксплаатацыю баня ў горадзе Косаве. У яе аднаўленні прымалі ўдзел усе жыхары горада.

Адказны рэдактар А. П. РУДОЙ.

Адрас рэдакцыі: Косаў, вул. Максіма Горкага 106.